# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Калтачэнка Аліны Ігараўны
“Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропры ў XVI–XVIII стст.”, прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Вялікае Княства Літоўскае ад пачатку фарміравалася і развівалася як дзяржава на мяжы цывілізацый і культур. Таму не дзіўна, што прывілеяванае саслоўе ВКЛ, асабліва пасля Крэўскай уніі, імкнулася далучыцца да здабыткаў заходнееўрапейскай культуры, якую ўспрымала як больш высокую і выкшталцоную. Атрыманне адукацыі ў вядучых заходнееўрапейскіх універсітэцкіх цэнтрах, адукацыйныя падарожжы магнатаў і шляхты (і не толькі) сталі асабліва распаўсюджанымі пад уплывам ідэй Адраджэння і, у сваю чаргу, спрыялі распаўсюджванню гэтых ідэй на нашых землях. Тым не менш, у айчыннай гістарычнай навуцы на сённяшні дзень недастаткова раскрыта праблема адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў ВКЛ у XVI–XVIII стст., не высветлена іх значэнне для грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця краіны. Дысертацыйнае даследаванне А.І. Калтачэнка стала першай сістэмнай спробай запоўніць гэты прабел.

Знаёмства з аўтарэфератам дазваляе зрабіць выснову, што кандыдацкая дысертацыя А.І. Калтачэнка характарызуецца прадуманасцю пабудовы, лагічнасцю структуры і выкладу матэрыялу. Дакладна сфармуляваны мэта і задачы даследавання, яго аб’ект і прадмет. Палажэнні, якія выносяцца на абарону, характарызуюцца навуковай значнасцю і навізной. Звяртае на сябе ўвагу лаканічны, але якасны аналіз гістарыяграфіі, а таксама кваліфікаваны агляд крыніц, якія належным чынам сістэматызаваны.

Укладам дысертанткі ў вывучэнне праблемы з’яўляецца характарыстыка прычын узнікнення феномену адукацыйных падарожжаў з тэрыторыі Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст., вызначэнне іх першапачатковай формы як «peregrinatio academica», калі галоўнай мэтай падарожжа былі ўніверсітэцкія веды. А.І. Калтачэнка пераканаўча паказала трансфармацыю такіх падарожжаў у гранд туры, якія давалі магчымасць пашырыць кругагляд, прывіць добры густ, азнаёміцца з дасягненнямі культуры і асаблівасцямі дзяржаўнага кіравання і потым рэалізаваць свае здабыткі на радзіме. Аўтаркай вызначаны спецыфічныя асаблівасці магнацкіх адукацыйных падарожжаў, абумоўленыя іх сацыяльным статусам і фінансавымі магчымасцямі. Адной з адметных асаблівасцяў была шырокая геаграфія падарожжаў, маршрут якіх традыцыйна праходзіў праз нямецкія землі, Францыю, Нідэрланды, Швейцарыю, Італію. Выбар маршрута і навучальных устаноў залежаў як ад традыцый роду, знакамітых прафесароў, так і ад канфесійнай прыналежнасці і палітычнай арыентацыі прадстаўнікоў магнацкіх сем’яў. У якасці характэрнай асаблівасці падарожжаў выступаюць таксама карэспандэнцыя з домам і напісанне дыярыушаў, што па

справядлівым меркаванні даследчыцы станавілася дадатковым элементам адукацыі і стварыла для гісторыкаў багатую групу нарратыўных крыніц.

Высокую ступень дакладнасці і аргументаванасці высноваў, атрыманых аўтарам, забяспечыла грунтоўная база крыніц. Даследчыкам выкарыстаны тастаменты, матрыкулы еўрапейскіх універсітэтаў, эпісталярныя і мемуарныя крыніцы, інструкцыі і павучанні, вучнёўскія працы, фінансавыя дакументы з архіваў і бібліятэк Беларусі, Польшчы, Літвы, Украіны.

Матэрыялы і вынікі дысертацыі прайшлі сур'ёзную апрабацыю на 15 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях як у Рэспубліцы Беларусь, гэтак і за яе межамі, з дастатковай паўнатою адлюстраваны ў 23 навуковых (з іх 6 артыкулаў у выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь для публікацыі вынікаў дысертацыйных даследаванняў) і адной вучэбнай публікацыі.

Тым не менш, на нашу думку, суіскальніку не ўдалося пазбегнуць некаторых недахопаў. Па-першае, уяўляецца залішнім імкненне падзяліць азначэнне Заходняй Еўропы як гістарычнага і геаграфічнага рэгіёнаў. На наш погляд, гэта наўрад ці магчыма. Па-другое, можна цалкам пагадзіцца з аўтарам у тым, што праблема адукацыйных падарожжаў амаль не закранаgalася ў беларускай гістарыяграфіі і існуюць толькі асобныя працы ў кантэксце гісторыі адукацыі. Але пры гэтым варта было б назваць і працы Георгія Якаўлевіча Галенчанкі, які з'яўяўся адным з пачынальнікаў гэтага даследчыцкага кірунку (гл., напрыклад: *Галенчанка, Г. Я. Студенты Великого княжества Литовского в Краковском университете XV–XVI вв. / Г.Я. Голенченко // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI в. : Проблемы взаимоотношений Польши, России, Украины, Белоруссии и Литвы в эпоху Возрождения / под ред. Б.А. Рыбакова. – М. : Наука, 1976. – С. 228–240*). Падкрэслім, што прыведзеныя заўвагі не зніжаюць агульнай станоўчай ацэнкі работы.

Такім чынам, паводле зместу аўтарэферата можна меркаваць, што дысертацыйная работа з'яўляецца завершаным даследаваннем, выканана аўтарам самастойна, на дастаткова высокім узроўні. Аналіз аўтарэферата дысертацыі сведчыць, што Калтачэнка Аліна Ігараўна – кваліфікаваная і ўдумлівая даследчыца, якая заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Загадчык кафедры гісторыі
і культурнай спадчыны
Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта
імя П.М. Машэрава,
канд. гіст. навук, дацэнт А.М. Дулаў

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"

Подпись удостоверяю
Начальник отдела кадров
Е.П. Соловьёва
16.01.2026